# Адрас тваёй мары — нашы факультэты

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1990 ЧАЦВЕР 8 ЛЮТАГА № 5 (1634)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

# Гасцінна расчыняе дзверы БДУ

Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна — адна са старэйшых і буйнейшых вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Ва ўсім свеце універсітэты заўсёды былі цэнтрамі навукі і культуры, актыўна садзейнічалі распаўсюджанню асветы.

Ва ўсе часы універсітэцкая адукацыя ставілася высока, таму што яна давала фундаментальныя веды, агульную культуру і шырыню поглядаў на свет. Універсітэт мае глыбокія гуманістычныя і дэмакратычныя традыцыі. БДУ імя У. І. Леніна — аўтарытэтны вучэбны і навуковы цэнтр краіны.

Беларускі універсітэт быў адкрыты 30 кастрычніка 1921 года. У першы год ён пачаў сваю работу ў саставе двух факультэтаў: медыцынскага і грамадскіх навук. У 1921—1922 навучальным годзе ў ім займалася 1390 студэнтаў. Прафесарска-выкладчыцкі састаў налічваў толькі 63 чалавекі.

За гады свайго існавання універсітэт падрыхтаваў звыш 60 тысяч спецыялістаў. За поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры і дасягненні ў развіцці навукі 7 студзеня 1967 года універсітэт узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У цяперашні час універсітэт перайшоў на новыя вучэбныя планы, у якіх галоўная ўвага ўдзяляецца выкладанню фундаментальных, базавых навук і прадугледжаны больш актыўны ўдзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце, вытворчай і педагагічнай практыках. Рыхтуючы кадры спецыялістаў, прафесарска-выкладчыцкі калектыў універсітэта вялікую ўвагу ўдзяляе ідэйна-выхаваўчай рабоце.

Зараз у вышэйшай школе, як і ва ўсёй краіне, ідзе перабудова. Мяняюцца вучэбныя планы, скарачаецца аб'ём абавязковых аўдыторных заняткаў, студэнтам прадстаўляюцца вялікія правы. Ужо год, як студэнты ўваходзяць у састаў вышэйшага органа універсітэта — вучоны савет. Кожны чацвёрты член савета — студэнт. Працуюць яны ў метадычнай і іншых камісіях.

Высокі ўзровень падрыхтоўкі кадраў ва універсітэце забяспечваецца тым, што на 112 яго кафедрах працуе шмат выдатных вучоных, якія вядомы сваімі навуковымі дасягненнямі і шырокай грамадскай дзейнасцю. Ва універсітэце больш за дзве тысячы выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў. Сярод іх 130 дактароў навук і прафесараў, больш як 700 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце сёння атрымліваюць адукацыю больш як 16 тысяч студэнтаў. З іх больш як 6 тысяч вучацца без адрыву ад вытворчасці — на вячэрнім аддзяленні і завочным факультэце.

Ва універсітэце вучыцца каля 1000 замежных студэнтаў.

БДУ прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы педагагічных кадраў для школ, сярэдніх спецыяльных устаноў і прафесійных вучылішчаў. Мы імкнёмся рабіць як мага больш для таго, каб нашы выпускнікі, будучыя педагогі, добра валодалі методыкай выкладання свайго прадмета, мелі грунтоўную універсітэцкую падрыхтоўку і шырокі кругагляд, былі добрымі арганізатарамі ў грамадскім жыцці.

Універсітэт пастаянна пашырае і ўмацоўвае канкрэтныя сувязі са школамі, сярэднімі спецыяльнымі ўстановамі, прафесійнымі вучылішчамі і органамі народнай асветы. Ужо сёння многія старшакласнікі маюць магчымасць займацца і актыўна наведваць школы юных, якія працуюць на факультэтах.

Ва універсітэце ёсць добрыя ўмовы не толькі для вучэбнай і навуковай работы, але і для адпачынку. Працуюць студэнцкія і спартыўныя клубы. Студэнты БДУ імя У. І. Леніна паспяхова выступаюць на розных спартыўных спаборніцтвах, спартакіядах, якія праводзяцца ў нашай краіне. Трынаццаць студэнцкіх калектываў мастацкай самадзейнасці, сямі з якіх прысвоена званне народных, сталі вядомымі не толькі ў нашай рэспубліцы, але і за яе межамі. Дзесяткі харавых, танцавальных, драматычных, эстрадных калектываў арганізаваны на факультэтах. Ёсць у нас і свая каманда КВЗ.

Калі глядзець у будучыню, то ў нашага універсітэта вялікія перспектывы. Урад рэспублікі і ЦК КПБ прынялі пастанову па развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта, у адпаведнасці з якой будзе пабудаваны новы універсітэцкі гарадок у раёне вёскі Шчамыслiца. Гэта будзе сучасны комплекс, які адпавядае ўсім міжнародным стандартам.

Сёння універсітэт пачынае рыхтавацца да прыёму новага папаўнення студэнтаў. Будуць праводзіцца алімпіяды, дні адчыненых дзвярэй, сустрэчы з вучнямі. Прыёмная камісія адкажа на ўсе пісьмы, якія прыходзяць ад тых, хто жадае прыняць удзел у конкурсных экзаменах на любы факультэт.

Абітурыент-90! Калі ты канчаткова вызначыў свой выбар і хочаш стаць высокакваліфікаваным спецыялістам — мы гасцінна адкрываем перад табой дзверы флагмана вышэйшай школы рэспублікі — Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Л. КІСЯЛЕЎСКІ,
рэктар
Белдзяржуніверсітэта
імя У. І. Леніна,
акадэмік АН БССР.



# ГІСТАРЫЧНЫ

НАРАДЗІЎСЯ гістарычны факультэт у верасні 1934 года ў патоку гіганцкіх сацыялістычных пераўтварэнняў, у перыяд практычнага ажыццяўлення выпрацаванай У. І. Леніным праграмы культурнай рэвалюцыі. У тыя гады на факультэце працавалі такія вядомыя вучоныя, як прафесар М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, Г. В. Яфімаў і іншыя.

На пачатак Вялікай Айчыннай вайны на факультэце было падрыхтавана 180 маладых спецыялістаў-гісторыкаў, а за ўсе пасляваенныя гады гістарычны факультэт выпусціў звыш 7 тысяч спецыялістаў. Больш як 200 чалавек абаранілі доктарскія і кандыдацкія дысертацыі і ўносяць вялікі ўклад у распрацоўку актуальных пытанняў гістарычнай навукі, у падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў гісторыкаў.

Зараз на факультэце два аддзяленні: гісторыі і гісторыі КПСС. Вучэбна-выхаваўчы працэс забяспечваюць 15 дактароў навук, прафесараў, 40 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Гэта высокакваліфікаваны калектыў, члены якога вядуць плённую педагагічную і навукова-даследчую работу. Патрэбна адзначыць, што большасць з іх з'яўляюцца выпускнікамі нашага гістарычнага факультэта. Сённяшнім студэнтам ёсць у каго павучыцца, ёсць у каго пераймаць вопыт, веды, навыкі, ёсць з каго браць прыклад, на каго раўняцца.

Высокі навуковы патэнцыял, вялікі вопыт вучэбна-выхаваўчай работы нашага прафесарска-выкладчыцкага калектыву дазваляе паспяхова весці падрыхтоўку кадраў гісторыкаў.

Аддзяленне гісторыі на дзённай і завочнай формах навучання рыхтуе спецыялістаў-гісторыкаў — выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства, якія маюць глыбокія тэарэтычныя веды і добрыя навыкі арганізатарскай і выхаваўчай работы. Пасля заканчэння факультэта ў асноўным яны будуць працаваць настаўнікамі ў сярэдніх школах рэспублікі.

Аддзяленне гісторыі КПСС, адкрытае ў 1983 годзе, рыхтуе на дзённай форме навучання выкладчыкаў гісторыі КПСС для вышэйшых і сярэдніх навучальных установ, навукова-даследчых работнікаў па гісторыка-партыйнай тэматыцы.

Абодва аддзяленні гістарычнага факультэта маюць аспірантуру. На вучобу ў яе накіроўваюцца найбольш падрыхтаваныя выпускнікі, якія ў час вучобы праявілі здольнасці да навукова-даследчай работы. Пасля заканчэння аспірантуры яны накіроўваюцца працаваць у ВНУ і навукова-даследчыя інстытуты.

Сёння калектыў факультэта мэтанакіравана глядзіць у будучыню. Менавіта тых, хто ў новым навучальным годзе прыйдзе на першы курс гістфака, чакаюць новыя адкрыцці і здзяйсненні. Ім ажыццяўляць школьную рэформу, працягваць эстафету добрых спраў старэйшага пакалення, памнажаць добрыя традыцыі факультэта, падтрымліваць яго аўтарытэт.

**Э. ЗАГАРУЛЬСКІ,**
дэкан гістарычнага факультэта.

# ФІЛАСОФСКА-ЭКАНАМІЧНЫ

АДКРЫЦЦЁ факультэта адбылося ў верасні 1989 года. Ён уключае ў сябе тры аддзяленні: філасофіі, палітэканоміі і сацыялогіі. Першыя два раней уваходзілі ў склад гістарычнага факультэта і ўжо маюць сваю гісторыю. Што ж датычыць аддзялення сацыялогіі, то яно з'яўляецца равеснікам факультэта, пачаўшы адлічваць сваю гісторыю са дня яго адкрыцця. Форма навучання — дзённая.

Спецыяльная падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца пяццю агульнауніверсітэцкімі кафедрамі: марксісцка-ленінскай філасофіі; гісторыі філасофіі і логікі; этыкі, эстэтыкі і атэізму; сацыялогіі; палітычнай эканоміі.

Акрамя асноўных курсаў, чытаецца вялікая колькасць спецкурсаў, якія забяспечваюць падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі, адукацыі і культуры.

На працягу пяці гадоў будучыя філосафы, сацыёлагі, эканамісты атрымліваюць вялікі аб'ём ведаў па розных дысцыплінах, наведваючы лекцыі і семінары, працуючы ў лабараторыях і кабінетах. Вучэбны працэс ажыццяўляецца кваліфікаванымі выкладчыкамі, сярод якіх пяць дактароў навук і прафесараў, больш за пяцьдзесят кандыдатаў навук, дацэнтаў. Для чытання лекцый запрашаюцца спецыялісты з Інстытута філасофіі і права АН БССР, а таксама з іншых навуковых цэнтраў рэспублікі і Саюза.

Асноўная ўвага пры падрыхтоўцы філосафаў удзяляецца глыбокаму вывучэнню асноў сусветнай і айчыннай філасофіі. Кожнае новае пакаленне філосафаў, спасцігаючы таямніцы быцця, шукае адказу на агульныя пытанні паходжання свету і чалавечага грамадства, авалодвае навыкамі дыялектычнага мыслення. Гэтаму садзейнічаюць спецыяльныя дысцыпліны прыродазнаўча-навуковага цыклу (асновы вышэйшай матэматыкі, фізікі, біялогіі).

Вучоба на аддзяленні палітэканоміі ўзбройвае ведамі сутнасці вытворчых адносін, законаў развіцця капіталістычнага і сацыялістычнага спосабаў вытворчасці. Будучыя эканамісты атрымліваюць добрую матэматычную падрыхтоўку, авалодваюць навыкамі канкрэтнага аналізу эканамічных працэсаў, вывучаюць гісторыю народнай гаспадаркі СССР і замежных краін, эканоміку асобных галін народнай гаспадаркі, бухгалтарскі ўлік, фінансава-крэдытную сістэму і іншыя спецыяльныя эканамічныя дысцыпліны.

Вучэбна-вытворчая практыка на аддзяленні палітэканоміі ставіць за мэту азнаямленне студэнтаў з арганізацыяй сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці, эканамічнымі функцыямі кіруючага апарата, арганізацыяй планавання і ўліку.

Выпускнікі аддзялення філасофіі і палітэканоміі накіроўваюцца на работу выкладчыкамі і лабарантамі ў ВНУ рэспублікі, навуковымі супрацоўнікамі ў навукова-даследчыя цэнтры і акадэмічныя інстытуты, выкладчыкамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

На аддзяленні сацыялогіі студэнты авалодваюць цэлым комплексам сацыялагічных дысцыплін агульнага і спецыяльнага характару, знаёмяцца з тэорыяй і гісторыяй сацыялагічнай спадчыны, асвойваюць навыкі машыннай апрацоўкі зыходных даных. Вялікая ўвага ўдзяляецца вывучэнню дысцыплін матэматычнага цыкла, агульнай і сацыяльнай псіхалогіі. Спецкурсы прысвечаны вывучэнню праблем працы, быту, зносін, кіравання, выхавання, культуры, адукацыі і г. д. Студэнты праходзяць практыку ў праблемнай сацыялагічнай лабараторыі, у інстытуце сацыялогіі АН БССР, на прадпрыемствах і ў арганізацыях. Тыя, хто закончыў аддзяленне, маюць шырокі дыяпазон размеркавання: ад работнікаў навукова-даследчых цэнтраў да сацыёлагаў на прамысловых прадпрыемствах.

Пачынаючы з другога курса, студэнты прыцягваюцца да актыўнай творчай дзейнасці, спрабуючы свае сілы ў навукова-даследчай рабоце, удзельнічаючы ў навуковых канферэнцыях, якія праводзяцца як у нашым універсітэце, так і ў ВНУ братніх рэспублік. Пасля заканчэння вучобы найбольш адораныя выпускнікі накіроўваюцца ў аспірантуру БДУ ці акадэмічных інстытутаў.

Цікава працякае грамадскае жыццё факультэта. Студэнты прымаюць актыўны ўдзел у палітычным жыцці, выконваючы розныя даручэнні фармальных і нефармальных арганізацый, удзельнічаючы ў рабоце саветаў, выбарных органаў, у перадвыбарных кампаніях, ажыццяўляючы шэфскую дапамогу жыхарам вёскі, выязджаючы летам у складзе будаўнічых атрадаў у розныя куткі Савецкага Саюза і нашай рэспублікі. Многія студэнты з'яўляюцца ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці і членамі спартыўных секцый.

**А. ЕЛСУКОЎ,**
дэкан філасофска-эканамічнага факультэта.

# ХІМІЧНЫ



Характэрнай рысай хіміі XX стагоддзя з'яўляецца не толькі яе бурнае развіццё і пранікненне амаль ва ўсе галіны прамысловасці і сельскай гаспадаркі, але і ўзнікненне на яе аснове новых навуковых дысцыплін, такіх, як хімія высокага ціску і тэмператур, плазмахімія, электрахімія, радыяцыйная хімія, хімія паверхневых з'яў і г. д. Нягледзячы на дыферэнцыяцыю хіміі, у цэлым яна становіцца больш строгай і цэласнай навукай. Гэтым яна абавязана фізіцы і матэматыцы, метады якой адыгрываюць выключную ролю ў раскрыцці хімічных з'яў і апісанні хімічных працэсаў.

Хімічны факультэт БДУ з'яўляецца адзінай базай у нашай рэспубліцы па падрыхтоўцы хімікаў з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй. Вучэбную і навуковую работу на факультэце вядуць 9 дактароў і звыш 70 кандыдатаў навук. Штогод на першы курс дзённага аддзялення прымаецца 125 студэнтаў, падрыхтоўка якіх з самага пачатку ажыццяўляецца асобна на вытворчым і педагагічным патоках па сямі спецыялізацыях: неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, арганічнай хіміі, фізічнай хіміі, хіміі высокамалекулярных злучэнняў, хіміі паўправаднікоў, радыяцыйнай хіміі. Па першых чатырох падрыхтоўка вядзецца і на вячэрняй форме навучання.

За час вучобы студэнты атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па асноўных дысцыплінах хімічнага цыкла, грамадскіх навуках, замежнай мове. Акрамя таго, забяспечваецца ў вялікім аб'ёме і фізіка-матэматычная падрыхтоўка, вывучаюцца метады планавання эксперыменту і выкарыстання ў хіміі вылічальнай тэхнікі.

Падрыхтоўка па спецыялізацыях пачынаецца з чацвёртага курса. У гэты перыяд навучання ўсе студэнты выконваюць навуковыя даследаванні, якія перарастаюць у дыпломныя работы. Значная частка дыпломных работ выконваецца ў навукова-даследчым інстытуце фізікахімічных праблем БДУ імя У. І. Леніна, у інстытутах АН БССР, на прамысловых прадпрыемствах.

Студэнты педагагічнага аддзялення разам з піянерскай і педагагічнай практыкамі праходзяць трохтыднёвую вытворчую практыку на хімічных прадпрыемствах. На вытворчым аддзяленні арганізуецца больш працяглая вытворчая практыка на прадпрыемствах і ў навукова-даследчых установах Мінска, Гомеля, Віцебска, Брэста. Выпускнікі педагагічнага аддзялення атрымліваюць кваліфікацыю «Хімік. Выкладчык» і накіроўваюцца на работу ў асноўным у агульнаадукацыйныя школы. Выпускнікі вытворчага аддзялення атрымліваюць кваліфікацыю «Хімік» і накіроўваюцца на працу ў навукова-даследчыя ўстановы або на прадпрыемствы. Пры гэтым большая частка выпускнікоў накіроўваецца ў электронную, радыётэхнічную і часткова ў хімічную прамысловасць.

За гады свайго існавання факультэт падрыхтаваў звыш трох тысяч спецыялістаў-хімікаў. Сярод іх член-карэспандэнт АН СССР прафесар А. Шлык, акадэмікі АН БССР У. С. Камароў, М. І. Міцкевіч, І. М. Ярмоленка, У. С. Салдатаў, В. В. Свірыдаў, члены-карэспандэнты АН БССР І. Р. Цішчанка, Р. Л. Старобінец, Ф. М. Капуцкі, заслужаныя настаўнікі БССР.

Да ўсіх, хто жадае прысвяціць сябе старадаўняй і вечна маладой навуцы — хіміі, мы звяртаемся: «Калі ласка!».

**В. ЦІКАВЫ,**
дэкан хімічнага факультэта.



# ГЕАГРАФІЧНЫ



ГЕАГРАФІЧНЫ факультэт — вядучы цэнтр падрыхтоўкі студэнтаў па фізічнай, эканамічнай геаграфіі, геамарфалогіі, краязнаўству і метадыцы арганізацыі экскурсійнай справы, рацыянальнаму прыродакарыстанню і ахове прыроды. У саставе факультэта сем кафедраў і пяць навукова-даследчых лабараторый: праблемная лабараторыя меліярацыі ландшафтаў, галіновая лабараторыя возеразнаўства, палеагеаграфічных метадаў пошуку карысных выкапняў, лабараторыя геахімічных праблем рацыянальнага выкарыстання мінеральных рэсурсаў і навукова-даследчая лабараторыя эканоміка-геаграфічных праблем рацыянальнага прыродакарыстання, а таксама геолага-мінералагічны музей, вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна», Браслаўская лімналагічная станцыя.

Студэнты факультэта атрымліваюць вялікую і разнастайную прыродазнаўча-навуковую і спецыяльную падрыхтоўку.

Значнае месца ў падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў належыць вучэбна-вытворчым практыкам. Студэнты І і ІІ курсаў на геаграфічнай станцыі «Заходняя Бярэзіна» праходзяць вучэбную практыку па тапаграфіі, геалогіі, гідралогіі, геамарфалогіі, глебазнаўству, метэаралогіі, біягеаграфіі, ландшафтазнаўству і эканамічнай геаграфіі. Штогод комплексная геаграфічная практыка студэнтаў ІІ курса праводзіцца за межамі рэспублікі (у Карпатах, на Каўказе і Урале, у Карэліі і Сярэдняй Азіі). Для больш глыбокага вывучэння прыроды, насельніцтва і гаспадаркі замежных краін студэнты накіроўваюцца ў шэраг замежных сацыялістычных краін (Балгарыю, Югаславію). Старшакурснікі праходзяць вытворчую практыку ў навукова-даследчых, праектных, планавых і гаспадарчых арганізацыях, уключаюцца ў састаў экспедыцый, якія праводзяць работу ў Беларусі і за яе межамі (Забайкалле, Далёкі Усход, Сярэдняя Азія, Каўказ і інш.). Студэнты факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Пры ўсіх кафедрах працуюць навукова-даследчыя гурткі.

Факультэт рыхтуе кадры спецыялістаў-географаў на двух аддзяленнях: педагагічным і вытворчым спецыялізацыі: геамарфалогія, рацыянальнае прыродакарыстанне і ахова прыроды, методыкі арганізацыі турысцка-экскурсійнай справы). Выпускнікі факультэта працуюць у агульнаадукацыйных школах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, інстытутах АН БССР, праектных і планавых арганізацыях, на картаграфічных прадпрыемствах, у гідраметэаслужбе, бюро падарожжаў і экскурсій, на турбазах.

**Р. ЖМОЙДЗЯК,**
дэкан геаграфічнага факультэта.

# БІЯЛАГІЧНЫ



ФАКУЛЬТЭТ рыхтуе біёлагаў па спецыяльнасці «Біялогія». Падрыхтоўка вядзецца на дзённай і завочнай формах навучання. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «Біёлаг», «Выкладчык біялогіі і хіміі». На дзённым аддзяленні ў 1988 годзе адкрыты вытворчы паток.

Агульнаадукацыйная падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца шляхам вывучэння цыкла грамадскіх і агульнаадукацыйных дысцыплін і дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла (псіхалогія, педагогіка, методыка выкладання біялогіі і хіміі і інш.).

Агульнапрафесійная падрыхтоўка пачынаецца з першага курса і забяспечваецца вывучэннем батанікі, заалогіі, анатоміі чалавека, цыталогіі і гісталогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, мікрабіялогіі і вірусалогіі, біяхіміі, біяфізікі, генетыкі з асновамі селекцыі, асноў імуналогіі, тэорыі эвалюцыі, экалогіі і рацыянальнаму прыродакарыстанню, біятэхналогіі і г. д.

Спецыялізацыя ажыццяўляецца па батаніцы, заалогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, біяхіміі, генетыцы, мікрабіялогіі і экалогіі, пачынаючы з III курса на стацыянары і з IV — на завочным аддзяленні. У рамках спецыялізацыі студэнты вывучаюць 10 спецдысцыплін, а таксама вялікі спецпрактыкум. На ўсіх курсах прадугледжаны практыкі: на I і II — па батаніцы і заалогіі ў натуральных біяцэнозах Беларусі, на III — вучэбная практыка па спецыялізацыі на кафедрах, у біяцэнозах, НДІ і г. д., на IV і V курсах — вытворчая і педагагічная практыкі.



Вучэбны працэс і навуковую работу факультэта забяспечваюць восем кафедраў, праблемная навукова-даследчая лабараторыя, навуковыя лабараторыі кафедраў, заамузей, батанічны сад, вучэбна-доследная гаспадарка «Шчамысліца».

Вучэбную і навуковую работу вядуць на факультэце 5 дактароў і больш за 40 кандыдатаў біялагічных навук, а таксама супрацоўнікі АН БССР біялагічнага профілю.

Пасля заканчэння факультэта выпускнікі накіроўваюцца на работу настаўнікамі сярэдніх школ і вучэбных устаноў, выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, супрацоўнікамі Дзяржкамітэта па ахове прыроды, запаведнікаў, а таксама на прадпрыемствы і ва ўстановы аграпрома, лясной гаспадаркі і інш.

Выпускнікі, якія паказалі схільнасць да навукова-даследчай работы, высокую эрудыцыю па біялогіі, атрымліваюць рэкамендацыю савета факультэта для паступлення ў аспірантуру, а таксама размяркоўваюцца ў інстытуты біялагічнага профілю АН БССР, прыкладныя інстытуты медыцынскага, сельскагаспадарчага і агульнабіялагічнага профілю на навуковую работу.

**А. ШУКАНАЎ,**
дэкан біялагічнага факультэта.

# ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ

ФАКУЛЬТЭТ прыкладной матэматыкі быў створаны ў 1970 годзе з мэтай прафесійнай падрыхтоўкі ў Беларусі матэматыкаў-прыкладнікоў, спецыялістаў у галіне прымянення матэматычных метадаў вырашэння і даследавання самых розных задач, якія ўзнікаюць у навуцы, тэхніцы і іншых галінах народнай гаспадаркі, з шырокім выкарыстаннем сучасных хуткадзеючых электронных вылічальных машын. Гэта спецыялісты, якія валодаюць глыбокімі ведамі па агульна-тэарэтычных і спецыяльных матэматычных дысцыплінах, знаёмы з магчымасцямі ЭВМ і здольны разам з прадстаўнікамі іншых спецыяльнасцей весці навукова-даследчую работу па складанню матэматычных мадэлей розных працэсаў, распрацоўцы алгарытмаў, іх лічбавага рашэння на ЭВМ, а таксама па стварэнню матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання ЭВМ і праектавання саміх АСК і іх комплексаў.

На працягу першых двух гадоў студэнты факультэта прыкладной матэматыкі атрымліваюць глыбокую агульнанавуковую падрыхтоўку, якая ўключае асноўныя матэматычныя дысцыпліны, а таксама асновы эксплуатацыі ЭВМ.

Спецыяльнасць прыкладная матэматыка ўключае наступныя спецыялізацыі: матэматычная фізіка, матэматычнае мадэліраванне, вылічальная дыягностыка, лічбавыя метады, даследаванне аперацый і сістэмны аналіз, аптымізацыя і аптымальнае кіраванне, тэорыя імавернасцяў і матэматычная статыстыка, матэматычная кібернетыка, матэматычнае і праграмнае забеспячэнне праблемна-арыентаваных сістэм, архітэктура вылічальных сістэм і сетак, матэматычнае забеспячэнне аўтаматызаваных сістэм праектавання і кіравання, матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын і сістэм.

Навучанне заканчваецца абаронай дыпломнага праекта і здачай дзяржаўных экзаменаў.

З 1989 года факультэт пачаў таксама падрыхтоўку па спецыяльнасці «Праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм». Гэта спецыяльнасць уключае наступныя спецыялізацыі: праграмнае забеспячэнне вылічальных сістэм, праграмнае забеспячэнне аўтаматызаваных вытворчасцяў, праграмнае забеспячэнне сістэм аўтаматызацыі праектавання, сістэмы штучнага інтэлекту. Новая спецыяльнасць прадугледжвае большую накіраванасць на навуковыя і тэхнічныя праблемы, звязаныя са стварэннем і выкарыстаннем аўтаматызаваных і вылічальных сістэм.

Навучанне заканчваецца абаронай дыпломнага праекта і здачай дзяржаўных экзаменаў па спецыяльнасці і марксізму-ленінізму. Выпускнікам факультэта прысвойваецца кваліфікацыя матэматыка. Яны накіроўваюцца на работу ў навукова-даследчыя інстытуты, КБ прадпрыемстваў электроннай і радыёпрамысловасці, вылічальныя цэнтры, а таксама ў іншыя арганізацыі, якія выкарыстоўваюць ЭВМ. Лепшыя студэнты працягваюць вучобу ў аспірантуры.

Уся вучэбная і навукова-даследчая работа са студэнтамі вядзецца выкладчыкамі дзесяці кафедраў, супрацоўнікамі галіновых лабараторый і вылічальнага цэнтра, а таксама вядомымі спецыялістамі з прадпрыемстваў і ўстаноў, з якімі факультэт падтрымлівае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва.

У 1982 годзе на факультэце адкрылася вячэрняе аддзяленне, тым самым выпускнікі радыётэхнікума і політэхнікума і іншыя абітурыенты, якія спецыялізаваліся па прыкладной матэматыцы ці маюць дачыненне да ЭВМ, маюць магчымасць павышаць кваліфікацыю без адрыву ад вытворчасці.

Вялікая ўвага надаецца самастойнай навукова-даследчай рабоце студэнтаў. На факультэце працуюць студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, у якіх студэнты, выкарыстоўваючы тэарэтычныя веды, распрацоўваюць пакеты прыкладных праграм для вырашэння розных задач народнай гаспадаркі і ўкараняюць перспектыўнае матэматычнае забеспячэнне АСК і ЭВМ.

Да паслуг студэнтаў — класы дыялогавых вылічальных комплексаў ДВК-3М, дысплейныя класы для работы ў рэжыме СВМ, клас на базе міні-ЭВМ СМ-4 і інш.

**В. КАРЗЮК,**
дэкан факультэта прыкладной матэматыкі.

# РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ

ФАКУЛЬТЭТ радыёфізікі і электронікі БДУ імя У. І. Леніна быў адкрыты ў 1976 годзе на базе радыёфізічнага аддзялення фізічнага факультэта. Зараз гэта буйны вучэбны і навуковы цэнтр, у якім вучыцца звыш 1200 студэнтаў. На дзевяці кафедрах працуе 66 выкладчыкаў, сярод якіх два члены-карэспандэнты АН БССР, восем дактароў навук і прафесараў. Пры кафедрах функцыяніруюць шэсць навуковых лабараторый. Штогадовы аб'ём выконваемых гаспадарча-дагаворных работ па заказу прадпрыемстваў рэспублікі і Саюза складаюць 2 млн. 519 тыс. рублёў.

Факультэт рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў на базе фундаментальных курсаў агульнай і тэарэтычнай фізікі, вышэйшай матэматыкі і інфарматыкі, агульных і спецыяльных радыёфізічных курсаў. Выпускнікі факультэта карыстаюцца вялікім попытам навукова-даследчых лабараторый прадпрыемстваў электроннай прамысловасці. Лепшыя з іх рэкамендуюцца для паступлення ў аспірантуру.

Падрыхтоўка радыёфізікаў вядзецца на дзённай і вячэрняй формах навучання па адной з наступных больш вузкіх спецыялізацый, што ажыццяўляюць адпаведныя спецыяльныя кафедры:

КАФЕДРА ФІЗІЧНАЙ ЭЛЕКТРОНІКІ вядзе падрыхтоўку па дзвюх спецыялізацыях «фізічная электроніка і мікраэлектроніка» і «плазменная электроніка». Кафедра мае свой філіял на НВА «Інтэграл» і для гэтага аб'яднання рыхтуе мэтавым прызначэннем частку сваіх выпускнікоў па мікраэлектроніцы.

У працэсе навучання студэнты вывучаюць фізічныя працэсы, якія ляжаць у аснове работы сучасных вырабаў электронікі і мікраэлектронікі.

КАФЕДРА РАДЫЁФІЗІКІ ажыццяўляе падрыхтоўку па наступных спецыялізацыях: «прыём і апрацоўка інфармацыі» і «радыёоптыка і галаграфія». Студэнты вывучаюць працэсы і схемы вырашэння па прыёму і апрацоўцы сігналаў у шырокім дыяпазоне частот, уключаючы ЗВЧ, дыфракцыю радыёхваль і выпраменьваючыя сістэмы.

КАФЕДРА КВАНТАВАЙ РАДЫЁФІЗІКІ І ОПТАЭЛЕКТРОНІКІ рыхтуе спецыялістаў па спецыяльнасцях «Квантавая радыёфізіка і лазерныя сістэмы» і «фізіка і тэхніка оптыкаэлектронных сістэм». Студэнты атрымліваюць неабходныя веды ў галіне тэорыі і практычнага выкарыстання лазерных і оптаэлектронных сістэм, прызначаных для навуковых даследаванняў, уключаючы аэракасмічную дыягностыку навакольнага асяроддзя.

КАФЕДРА ЭЛЕКТРОННЫХ МАТЭМАТЫЧНЫХ МАШЫН ажыццяўляе спецыялізацыі «электронныя матэматычныя машыны» і «мікрапрацэсары і мікрапрацэсарныя сістэмы». У працэсе навучання студэнты атрымліваюць глыбокія веды па тэорыі вылічальных машын, праграміраванню, аўтаматызаванаму праектаванню ў мікраэлектроніцы, вывучаюць структуры сучасных ЭВМ і набываюць практычныя навыкі па іх выкарыстанню.

КАФЕДРА АЎТАМАТЫЗАЦЫІ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ вядзе спецыялізацыю, у працэсе якой студэнты вывучаюць аўтаматызаваныя сістэмы, планаванне і метралогію эксперыменту, камп'ютэрныя спосабы апрацоўкі інфармацыі.

КАФЕДРА КІБЕРНЕТЫКІ ажыццяўляе спецыялізацыю «сістэмы кіравання і ажыўлення робатаў». Тут студэнты вывучаюць пытанні, звязаныя з праектаваннем робатаў і гібкіх аўтаматызаваных сістэм на іх аснове.

КАФЕДРА НАДЗЕЙНАСЦІ ВЫРАБАЎ РАДЫЁЭЛЕКТРОНІКІ ажыццяўляе спецыялізацыю «надзейнасць вырабаў электроннай прамысловасці». Кафедра мае філіял на НВА «Інтэграл» і разам з ім рыхтуе спецыялістаў, здольных аналізаваць прычыны псавання інтэгральных схем і павышаць іх эксплуатацыйныя характарыстыкі.

КАФЕДРА ЦВЕРДАЦЕЛЬНАЙ ЭЛЕКТРОНІКІ. Спецыялізацыя кафедры «фізіка матэрыялаў і тэхналогій электроннай тэхнікі». Гэта самая маладая спецыялізацыя. Наведваючы яе, студэнты будуць вывучаць фізічныя працэсы, што адбываюцца ў паўправадніковых матэрыялах пры вытворчасці вырабаў мікраэлектронікі, спосабы мэтанакіраванага змянення ўласцівасцей цвёрдых цел.

Фундамент спецыялізацыі складае паглыбленае вывучэнне агульнай і тэарэтычнай фізікі, якое на малодшых курсах вядзе кафедра фізікі.

Усім, хто захапляецца радыёфізікай і хоча стаць высокакваліфікаваным спецыялістам у гэтай галіне, мы гаворым: «Калі ласка!»

В. ТКАЧЭНКА,
в. а. дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі.

# ФІЛАЛАГІЧНЫ



ВЫШЭЙШАЯ філалагічная адукацыя ў Беларусі бярэ свой пачатак з часу арганізацыі універсітэта. І мы ганарымся тым, што сярод першых выкладчыкаў беларускай філалогіі быў народны паэт БССР К. М. Міцкевіч (Якуб Колас). У далейшыя гады на факультэце працавалі такія вядомыя філолагі, як І. І. Замоцін, Я. І. Барычэўскі, А. М. Вазнясенскі, М. М. Піатуховіч і іншыя.

На факультэце вядзецца падрыхтоўка па дзвюх спецыяльнасцях: беларускай мове і літаратуры; рускай мове і літаратуры. Вучэбную, навуковую і выхаваўчую работу вядуць 9 кафедраў, якія аб'ядноўваюць вялікі навукова-педагагічны калектыў. Свае багатыя веды і любоў да родных беларускай і рускай моў і літаратур перадаюць моладзі высокакваліфікаваныя спецыялісты.

На факультэце грунтоўна вывучаюцца грамадскія навукі.

Акрамя родных моў і літаратур усе студэнты вывучаюць таксама замежныя мовы (англійскую, нямецкую, французскую, іспанскую), лацінскую мову і славянскія мовы (польскую, серба-харвацкую, чэшскую, балгарскую).

Сярод дысцыплін, якія вызначаюць філалагічную падрыхтоўку студэнтаў, патрэбна адзначыць моваэнаўчыя і літаратуразнаўчыя.

Да моваэнаўчых дысцыплін адносяцца курсы ўводзін у мовазнаўства і агульнае мовазнаўства, уводзіны ў славянскую філалогію, стараславянская мова, дыялекталогія, асновы культуры мовы, стылістыка. Найбольшая колькасць гадзін адводзіцца на курс сучаснай беларускай (рускай, славянскай) літаратурнай мовы і яе гісторыі як дысцыпліны.

Літаратуразнаўчыя дысцыпліны ўключаюць у сябе ўводзіны ў літаратуразнаўства, тэорыю літаратуры, гісторыю крытыкі, вусную народную творчасць, гісторыю літаратуры, сучасную савецкую літаратуру, гісторыю замежных літаратур і літаратур народаў СССР.

Факультэт ганарыцца тым, што сярод яго выпускнікоў — вядомыя пісьменнікі і паэты: К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, К. Чорны, П. Трус, І. Мележ, А. Адамовіч, І. Навуменка і многія іншыя. І зараз у літаратурным аб'яднанні «Узлёт» рыхтуецца стаць пісьменнікамі і крытыкамі творчая моладзь факультэта.

Пры кафедрах працуюць гурткі, у якіх студэнты займаюцца навукова-даследчай работай.

Факультэт — буйнейшы цэнтр у краіне па падрыхтоўцы русістаў і беларусістаў для замежных краін. Толькі за апошнія дзесяць гадоў на філфаку прайшлі навучанне звыш 500 студэнтаў з дваццаці краін свету.

Тых, хто хоча глыбока пазнаць таямніцы роднай мовы і літаратуры, факультэт чакае ў сваіх аўдыторыях.

А. ВОЛК,
дэкан філалагічнага факультэта.



# ЖУРНАЛІСТЫКІ

У БЕЛАРУСІ ва ўсіх рэдакцыях газет, радыё і тэлебачання, выдавецтвах працуюць выпускнікі факультэта журналістыкі. Больш трох тысяч байцоў ідэалагічнага фронта вучыліся ва універсітэце тайнам і майстэрству складанай прафесіі. Цяпер на факультэце больш за 800 студэнтаў — будучых журналістаў. У нас дзейнічае таксама аддзяленне замежных студэнтаў, дзе займаюцца пасланцы з 48 краін свету. Факультэт ганарыцца сваімі выпускнікамі, якія сталі вядомымі журналістамі, пісьменнікамі, партыйнымі і грамадскімі дзеячамі.

На факультэце журналістыкі вучыцца нялёгка, але цікава. За пяць гадоў вучобы будучы журналіст абавязаны глыбока авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй, добра ведаць актуальныя праблемы і законы сацыялістычнай эканомікі, навукова-тэхнічнага прагрэсу, навучыцца з партыйных пазіцый абагульняць з'явы і факты грамадскага жыцця і даходліва асвятляць іх, набыць навыкі карэспандэнцкай і рэдактарскай работы. Таму разам з агульнымі універсітэцкімі дысцыплінамі вывучаецца шэраг спецыяльных: гісторыя рускай, партыйна-савецкай і замежнай журналістыкі, тэорыя і практыка савецкага друку, радыё і тэлебачання, журналісцкае майстэрства, тэхніка афармлення газет, радыё- і тэлеперадач, асновы эканомікі сельскай гаспадаркі і прамысловасці, савецкае права, прыкладная сацыялогія, практычная стылістыка і рэдагаванне. Выпускнікі факультэта атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па рускай і беларускай мовах, беларускай, рускай і замежнай літаратуры, вывучаюць асновы фотарэпартажу, тэхніку машынапісу, набываюць практычныя навыкі журналісцкай работы не толькі ў час лабараторных і практычных заняткаў, але і ў перыяд вытворчай практыкі, якую яны праходзяць у рэдакцыях раённых, шматтыражных, абласных, галіновых і рэспубліканскіх газет, у камітэтах па радыёвяшчанню і тэлебачанню.

Акрамя таго на факультэце працуюць тэлецэнтр, радыёстудыя, фоталабараторыя, лінгафонны кабінеты, студэнты выпускаюць вучэбную газету «Журналіст».

Вучэбны працэс на факультэце вядуць вопытныя выкладчыкі, сярод іх восем дактароў і 20 кандыдатаў навук, а таксама вядомыя журналісты рэспублікі.

Паступаючыя на факультэт абавязаны даказаць, што іх выбар спецыяльнасці не выпадковы. Гэтай мэце служыць творчы конкурс, які праводзіцца ў тры этапы. Спачатку абітурыенты накіроўваюць у прыёмную камісію свае публікацыі, сцэнарыі радыё- і тэлеперадач і, дадаткова, нідзе не апублікаваныя работы, якія ацэньвае спецыяльнае журы. Тыя, хто прайшоў папярэдні этап, выклікаюцца ва універсітэт, дзе пішуць пісьмовую работу. Яе мэта — выявіць журналісцкія здольнасці абітурыента. З пераможцамі гэтага этапа праводзіцца гутарка, у час якой выяўляецца іх грамадска-палітычная падрыхтаванасць, шырыня інтарэсаў, агульны кругагляд.

Усе паступаючыя абавязаны таксама прадставіць у прыёмную камісію характарыстыкі-рэкамендацыі тых газет, часопісаў, камітэтаў па радыёвяшчанню і тэлебачанню, дзе яны супрацоўнічалі.

Каго не палохаюць цяжкасці журналісцкай прафесіі, хто хоча данесці праўду аб нашых днях будучым пакаленням, мы запрашаем на вучобу на факультэт журналістыкі.

**А. СЛУКА,**
**дэкан факультэта журналістыкі.**




# МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ

ПАДРЫХТОЎКА спецыялістаў-матэматыкаў у Беларусі пачалася ў 1923 годзе з утварэннем у Белдзяржуніверсітэце фізіка-матэматычнага факультэта, які з мэтай далейшага паляпшэння падрыхтоўкі маладых спецыялістаў і больш поўнага забеспячэння ўзрослых патрэб навукі, тэхнікі, народнай гаспадаркі і школ рэспублікі ў 1958 годзе быў падзелены на два факультэты — фізічны і механіка-матэматычны.

Механіка-матэматычны факультэт вядзе падрыхтоўку спецыялістаў па дзвюх спецыяльнасцях — механіцы і матэматыцы. Механікі універсітэцкага профілю атрымліваюць глыбокую матэматычную падрыхтоўку, фундаментальную адукацыю ў галіне механікі і неабходныя навыкі ў праграміраванні і выкарыстанні ЭВМ. Пасля заканчэння універсітэта ім прысвойваецца кваліфікацыя «Механік, матэматык-прыкладнік». З 1987—1988 навучальнага года на аддзяленні механікі адкрыліся новыя спецыялізацыі «САПР механічных сістэм», «Механіка робатаў і маніпулятараў», якім у сувязі з павелічэннем у рэспубліцы аўтаматызаваных вытворчасцей будзе ўдзяляцца значная ўвага.

Падрыхтоўка спецыялістаў-матэматыкаў на факультэце вядзецца на аддзяленнях: навукова-вытворчым, навукова-педагагічным і аддзяленні матэматычнай электронікі. Аддзяленне матэматычнай электронікі адкрылася на факультэце ў 1986 годзе для падрыхтоўкі спецыялістаў, якія будуць працаваць на прадпрыемствах Міністэрства электроннай прамысловасці СССР, а таксама ў іншых галінах народнай гаспадаркі. Падрыхтоўка па гэтай спецыялізацыі вядзецца па індывідуальнаму вучэбнаму плану, распрацаванаму на факультэце з удзелам вядучых спецыялістаў ВА «Інтэграл».

Конкурс паступаючых на кожнае з гэтых аддзяленняў праводзіцца паасобна. Студэнты атрымліваюць фундаментальную матэматычную падрыхтоўку.

Пасля размеркавання на чацвёртым курсе спецыялізацыя студэнтаў праводзіцца з улікам характару іх будучай работы.

На навукова-вытворчым аддзяленні робіцца акцэнт на навучанне пастаноўцы і рашэнне розных матэматычных задач. Студэнты навукова-педагагічнага аддзялення вывучаюць дысцыпліны псіхолага-педагагічнага характару.

У апошнія гады факультэт заключыў дагаворы аб супрацоўніцтве з многімі навуковымі і вучэбнымі цэнтрамі рэспублікі і краіны, такімі, як АН БССР, з некаторымі аддзеламі АН СССР, двума матэматычнымі факультэтамі МДУ і іншымі.

У вучэбным працэсе, акрамя кваліфікаванага прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэта, удзельнічаюць вядомыя вучоныя і спецыялісты Інстытута матэматыкі АН БССР, галіновых навукова-даследчых інстытутаў, вядучых прадпрыемстваў рэспублікі.

Выпускнікі факультэта — матэматыкі навукова-вытворчага аддзялення працуюць у навукова-даследчых акадэмічных і галіновых інстытутах, канструктарскіх бюро, лабараторыях і вылічальных цэнтрах, на прадпрыемствах прамысловых міністэрстваў і ведамстваў, у вышэйшых і сярэдніх навучальных установах. Выпускнікі навукова-педагагічнага аддзялення накіроўваюцца ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы і агульнаадукацыйныя школы. А тыя, каго зацікавіць навукова-даследчая работа, атрымаюць рэкамендацыі ў аспірантуру.

Факультэт ганарыцца сваімі выпускнікамі, сярод якіх — лаўрэаты Ленінскай прэміі, прэмій Ленінскага камсамола Беларусі і краіны, Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, акадэмікі, заслужаныя настаўнікі і вядучыя спецыялісты многіх арганізацый.

**Л. ПРЫМАЧУК,**
**дэкан механіка-матэматычнага факультэта.**

# ЮРЫДЫЧНЫ



ЮРЫДЫЧНЫ факультэт — адзін з асноўных цэнтраў Беларусі па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў па правазнаўству. Яго выпускнікі працуюць у партыйных і савецкіх органах, пракуратуры, судах, міліцыі, навуковых і гаспадарчых установах.

На факультэце падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца на дзённай форме навучання з тэрмінам навучання 5 гадоў, на завочным аддзяленні — 6 гадоў. На завочнае аддзяленне ў першую чаргу залічваюцца асобы, якія працуюць па спецыяльнасці.

За час вучобы на факультэце студэнты вывучаюць дзяржаўнае, адміністрацыйнае, міжнароднае, працоўнае, калгаснае, грамадзянскае, сямейнае і крымінальнае права, крымінальны і грамадзянскі працэс, крыміналістыку і іншыя спецыяльныя дысцыпліны.

Юрыдычны факультэт рыхтуе спецыялістаў шырокага профілю па трох спецыялізацыях: дзяржаўна-прававой, гаспадарча-прававой, судова-пракурорскаследчай дзейнасці.

Дзяржаўна-прававая. Гэта спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацыях, у выканкомах мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, а таксама ў апаратах міністэрстваў, ведамстваў і іншых органаў дзяржаўнай улады і кіравання.

Гаспадарча-прававая. Выпускнікі гэтай спецыялізацыі накіроўваюцца на работу ў міністэрствы, ведамствы, вытворчыя аб'яднанні, на прадпрыемствы, ва ўстановы і арганізацыі для работы юрысконсультамі.

Судова-пракурорска-следчай дзейнасці. Па гэтай спецыялізацыі вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракурораў, следчых, адвакатаў, дзяржаўных натарыусаў і іншых работнікаў юстыцыі.

На факультэце працуюць сем спецыяльных кафедраў: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, грамадзянскага і сямейнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крымінальнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, крыміналістыкі. Усе кафедры ўкамплектаваны высокакваліфікаванымі спецыялістамі. На факультэце 77 выкладчыкаў. Сярод іх — 12 прафесараў, 55 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

Студэнты факультэта актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце. Яны пішуць курсавыя работы, займаюцца ў навуковых гуртках, выступаюць з дакладамі на студэнцкіх навуковых канферэнцыях, удзельнічаюць у рэспубліканскіх і ўсесаюзных аглядах-конкурсах студэнцкіх навуковых работ.

У лістападзе 1987 года ў Рызе на Усесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» зборная Беларускай ССР, сфарміраваная на базе юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, заняла першае месца, а на аналагічных алімпіядах у 1988 і 1989 гадах — адпаведна трэцяе і другое месцы.

У час вучобы на факультэце студэнты праходзяць вучэбную і вытворчую практыкі ў народных судах, пракуратуры, следчых органах, юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і ўстаноў. Заканчваецца навучанне абаронай дыпломнай работы, здачай дзяржаўных экзаменаў.

На факультэце ёсць бібліятэка, крыміналістычная лабараторыя, лабараторыя савецкага заканадаўства, а таксама пракурорска-следчай дзейнасці.

Студэнты факультэта, якія добра праявілі сябе ў навукова-даследчай рабоце, рэкамендуюцца для паступлення ў аспірантуру. Прафесарска-выкладчыцкі састаў юрыдычнага факультэта камплектуецца ў асноўным выпускнікамі факультэта, якія абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

Многія выпускнікі юрыдычнага факультэта працуюць у Пракуратуры БССР Міністэрстве ўнутраных спраў БССР, Вярхоўным судзе БССР, Міністэрстве юстыцыі БССР, у абласных і народных судах, пракурорамі абласцей і раёнаў, следчымі, адвакатамі, начальнікамі юрыдычных аддзелаў міністэрстваў і ведамстваў, прававых службаў прадпрыемстваў і ўстаноў.

**В. ГАДУНОЎ,**
дэкан юрыдычнага факультэта.

# ФІЗІЧНЫ



ФАКУЛЬТЭТ рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў па важнейшых напрамках сучаснай фізікі для навукова-даследчых устаноў, прамысловых прадпрыемстваў і народнай адукацыі.

На факультэце вядзецца навучанне па дзённай і вячэрняй формах. На дзённай форме працуе два аддзяленні: навукова-вытворчае і навукова-педагагічнае, якія адрозніваюцца вучэбнымі планамі і праграмамі. На вячэрнім аддзяленні (навучанне без адрыву ад вытворчасці) вучэбныя планы і праграмы супадаюць з планамі і праграмамі навукова-вытворчага аддзялення. Конкурс на ўсе аддзяленні і патокі асобны.

Падрыхтоўка спецыялістаў-фізікаў на факультэце ажыццяўляецца па розных галінах сучаснай фізічнай навукі: тэорыі класічных і квантавых палёў, тэорыі элементарных часціц, спецыяльнай і агульнай тэорыі адноснасці, фізіцы ядра, фізіцы ядзерных энергетычных установак, фізіцы тонкіх плёнак і ахоўных пакрыццяў, фізіцы цвёрдага цела, фізічнай оптыцы, цеплафізіцы, біяфізіцы, фізіцы плазмы, фізіцы паўправаднікоў, мікраэлектроніцы, электроннаму прыладабудаванню.

Выпускнікі факультэта атрымліваюць размеркаванне ў навукова-даследчыя інстытуты і канструктарскія бюро Акадэміі навук БССР, у ВНУ краіны, галіновыя НДІ і лабараторыі. Аднак фізікі патрабуюцца не толькі там. У наш час, час навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і хуткага збліжэння вытворчасці з навукай, у шэрагу галін прамысловасці ўжо нельга правесці выразную мяжу паміж інжынерам і вучоным, паміж канструктарам-распрацоўшчыкам і навуковым першапраходцам. Да такіх галін вытворчасці належаць прадпрыемствы, якія выпускаюць сучасныя аптычныя прылады, інтэгральныя схемы, электронныя вылічальныя машыны. Тут таксама працуюць выпускнікі фізічнага факультэта.

А тым, хто хацеў бы стаць выкладчыкам фізікі ў школе, тэхнікуме, ПТВ, мы прапаноўваем паступаць на педагагічнае аддзяленне нашага факультэта. Тут разам з фундаментальнай падрыхтоўкі па фізіцы яны атрымаюць неабходныя веды па педагогіцы, псіхалогіі, вывучаць методыку выкладання фізікі.

Шмат увагі на факультэце ўдзяляецца ўсебаковаму развіццю здольнасцей будучых спецыялістаў. Студэнты факультэта актыўна займаюцца навукова-даследчай работай. На факультэце функцыяніруе болей дзесяці гурткоў па розных фізічных праблемах, студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. Штогод праводзіцца студэнцкая навукова-даследчая канферэнцыя.

Не многа вольнага часу ў студэнта. Аднак і ім можна карыстацца цікава і з карысцю. Мастацкая самадзейнасць, заняткі спортам, факультэт грамадскіх прафесій... Асаблівай папулярнасцю ў нас карыстаюцца дні Фізіка — вясёлае свята ўсяго факультэта. Падрыхтоўка да яго пачынаецца задоўга да правядзення, а праграма захоўваецца аргкамітэтам у глыбокай тайне.

У час летніх канікулаў студэнты працуюць у студэнцкіх будаўнічых атрадах, сельгасатрадах, навукова-вытворчых атрадах.

Наш факультэт мае слаўныя традыцыі, ён ганарыцца сваімі выпускнікамі. Такімі, напрыклад, як акадэмікі Л. А. Арцымовіч, М. А. Барысевіч, акадэмік АН БССР Ф. І. Федараў. Сярод былых студэнтаў факультэта 4 Героі Сацыялістычнай Працы, 22 акадэмікі і члены-карэспандэнты АН СССР і АН БССР, 6 лаўрэатаў Ленінскай прэміі, болей 40 лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій СССР, БССР, Ленінскага камсамола.

**А. КЛІШЧАНКА,**
дэкан фізічнага факультэта.











# *Кароткі даведнік абітурыента*

Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна праводзіць у 1990—1991 навучальным годзе прыём студэнтаў

## НА ДЗЕННАЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, журналістыка, гісторыя, філасофія, правазнаўства, палітычная эканомія, матэматыка (аддзяленні: педагагічнае, вытворчае, механікі, матэматычнай электронікі), прыкладная матэматыка, прагрaмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм, біялогія, геаграфія (педагагічнае і вытворчае аддзяленні), хімія (педагагічнае і вытворчае аддзяленні), фізіка (педагагічнае і вытворчае аддзяленні), радыёфізіка і электроніка, сацыялогія.



## НА ВЯЧЭРНЯЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

радыёфізіка і электроніка, прыкладная матэматыка, хімія, беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура.



## НА ЗАВОЧНАЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, правазнаўства, гісторыя, журналістыка, біялогія, геаграфія, матэматыка.



Усе паступаючыя падаюць заяву на імя рэктара універсітэта па адзінай форме (гл. прылажэнне да Правілаў прыёму ў ВНУ). Да заявы прыкладаюцца: атэстат аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), выпіска з працоўнай кніжкі (для тых, хто працуе), медыцынская даведка, чатыры фотакарткі (3Х4 см).

Дакументы і пытанні дасылайце на адрас: 220080, г. Мінск, Ленінскі праспект, 4, БДУ імя У. І. Леніна, прыёмная камісія.






БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Колоса.

8 лютага 1990 г.

Зак. 2003.

Т. 2000 экз.



220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, БАБРУЙСКАЯ, 9, IV паверх, п. 72—73.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКА